# Ад сэрца да сэрца

**У Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна напрыканцы ліпеня ў рамках выставы “Падарожжа па Венесуэле” адбылася чарговая сустрэча з першым сакратаром Пасольства Венесуэлы ў Беларусі Майрэнай Ньевес.**








Праект “Падарожжа па Венесуэле” ладзіцца ў выставачнай зале скарбніцы па ініцыятыве Пасольства Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь сумесна з Лацінаамерыканскім культурным цэнтрам імя Сімона Балівара.

А вось арганізатарам сустрэчы спадарыні Ньевес з мінчанамі выступіў клуб шматдзетных і сем’яў з дзецьмі з асаблівасцямі развіцця “Насустрач сонцу”, створаны ў Мінскай абласной бібліятэцы некалькі гадоў таму. Зразумела, што на імпрэзу ў першую чаргу былі запрошаны ўдзельнікі суполкі. Разам з імі ў Пушкінку завіталі юнакі і дзяўчаты з інваліднасцю, якія наведваюць аддзяленне сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў ТЦСАН Першамайскага раёна г. Мінска, падапечныя сталічных сацыяльных пансіянатаў “Выток” і “Вяча”.

Трэба адзначыць, што размова атрымалася надзвычай душэўнай. Майрэна Ньевес расказала аб шматгадовым эканамічным і культурным супрацоўніцтве нашых рэспублік, аб першым візіце былога лідара Венесуэлы Уга Чавеса ў Беларусь і аб тым, з якой цеплынёй ён згадваў паездку. Прайшло ўжо столькі часу, а пабрацімскія сувязі паміж двума народамі ўмацоўваюцца ўсё больш і больш. Пацвярджэнне таму — цяперашнія выстава і сустрэча.

— Урад нашай дзяржавы надае вялікае значэнне культурнаму супрацоўніцтву з рознымі краінамі і асабліва з вашай, — падкрэсліла першы сакратар Пасольства Венесуэлы ў Беларусі. — На працягу многіх гадоў мы развіваем нашы культурныя сувязі, праводзячы розныя сумесныя мерапрыемствы. І гэтая выстава — не адзіная імпрэза, зладжаная ў Беларусі нашым пасольствам. Культура з’яўляецца мостам для ўмацавання адносін паміж народамі, таму што менавіта з дапамогай культуры — мастацкіх палотнаў, музыкі, фотаздымкаў, скульптуры — мы мусім разумець адзін аднаго больш глыбока. Таму што ў творах, дзе прысутнічаюць эмоцыі, выдатнае веданне мовы неістотнае.

Спадарыня Ньевес нагадала, якую важную ролю ва ўмацаванні стасункаў паміж краінамі адыграла даўняе сяброўства Аляксандра Лукашэнкі і Уга Чавеса. Дарэчы, літаральна днямі народ Венесуэлы адзначыў 71-ю гадавіну з дня нараджэння свайго выбітнага палітычнага дзеяча.

Да таго ж Майрэна Ньевес разам з перакладчыкам Анастасіяй Астапчык прэзентавалі гасцям шырокую панараму жыцця Венесуэлы, якая прадстаўлена ў рамках тэматычнай выставы ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна. Дарослыя і дзеці даведаліся пра самыя маляўнічыя мясціны і незвычайныя прыродныя з’явы лацінаамерыканскай рэспублікі. Вадаспады, бялюткія пляжы, горы і пальмы, адметны жывёльны і раслінны свет — усё гэта на фотаздымках. А яшчэ — яркае нацыянальнае адзенне, промыслы, элементы побыту. Нашым хлопчыкам і дзяўчынкам, як і іх бацькам, было чаму дзівіцца.

Удзельнікаў сустрэчы пазнаёмілі з аўтэнтычнымі абрадамі, музыкай і танцамі венесуэльцаў, у чыёй культуры спляліся традыцыі народаў Афрыкі ды Іспаніі, а таксама карэннага насельніцтва краіны — індзейцаў. Самабытная творчасць уразіла маладых беларусаў не менш, чым фота.

Падлеткі з інваліднасцю не саромеліся пытацца ў спадарыні Ньевес пра яе радзіму і выказвалі шчырыя пачуцці: захапленне дзівоснымі краявідамі і нязвыклым для беларусаў ладам жыцця, цікавасць да дробязей і спадзяванні на тое, што камусьці з прысутных юнакоў і дзяўчат пашчасціць убачыць усю гэтую прыгажосць на ўласныя вочы.

А для яшчэ больш блізкага знаёмства з культурай рэспублікі ды іспанскай мовай, што з’яўляецца афіцыйнай у Венесуэле, усе ахвотныя паўдзельнічалі ў пазнавальнай гульні “Бінга!”. Трэба было вывучыць розныя іспанскія словы і знайсці адпаведныя карткі. Пераможцы, якія раней за іншых справіліся з задачай, атрымалі ў падарунак сувеніры Пасольства Венесуэлы ў Беларусі.

Акрамя гэтага, усім удзельнікам сустрэчы былі ўручаны кнігі, прысвечаныя Уга Чавесу, і сцяжкі Венесуэлы. А чальцы клуба шматдзетных і сем’яў з дзецьмі з асаблівасцямі развіцця “Насустрач сонцу” падрыхтавалі печыва з прадказаннямі для кожнага.

**Мікіта МІШЧАНКА,**
супрацоўнік аддзела маркетынгу
і сацыякультурнай дзейнасці
Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна





Выстава “Лета. Спякота” ў Нацыянальным мастацкім музеі працягнецца да 21 верасня.